УДК 930 (ИБеи)+357.71

# СПРОБА СТВАРЭННЯ ІНСТЫТУТА ЯЎРЭЙСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Шаўчук І.І. (г. Брэст, БрДУ),
Карзенка Г.У. (г. Мінск, БДПУ)

Імкненне Народнага камісарыята асветы Беларусі структурна аформіць нацыянальную яўрэйскую навуковую працу праяўляецца адначасова з інстытуалізацыяй навукі ў Беларусі з 1921 г. Як вядома, падмуркі навуковага комплексу рэспублікі сталі актыўна закладацца з пачатку гэтага года. Функцыі арганізацыі навуковай дзейнасці першапачаткова належалі Навукова-літаратурнаму аддзел Наркамата асветы, што праіснаваў з 7 лютага да канца 1921 г. У чэрвені 1921 г. адбылася рэарганізацыя НКА. Пры ім створаны Акадэмічны цэнтр (АЦ, Акадэмцэнтр), асновай якога стаў Навукова-літаратурны аддзел [9, с. 54]. Сярод асноўных задач, пастаўленых перад Акадэмцэнтрам, было непасрэднае кіраўніцтва ўстановамі, якія займаюцца навуковай акадэмічнай работай (Акадэміі, НДУ, вучоныя таварыствы і г.д.) [7, арк. 4; 9, с. 54]. Пералічаныя захады ў той ці іншай ступені вядомыя навуковай грамадскасці. Мы жа больш падрабязна спынімся на тым аспекце, які не атрымаў належнай увагі ў айчыннай гістарыяграфіі.

У прыватнасці, гэта тычыцца спробы стварэння Інстытута яўрэйскай культуры. Беларуская гістарыяграфія на дадзеную праблему ўвагі не звяртала. Згадак пра яўрэйскі інстытут у ёй практычна няма. Толькі, П.Ц. Петрыкаў [9, с. 55] і ўслед за ім М.У. Токараў [11, с. 133] салідарна канспектыўна адзначылі, што асноўнай прычынай, якая не дазволіла рэалізаваць гэту ідэю (ІЯК − Аўт.) з’яўляўся недахоп матэрыяльных сродкаў. Але пры больш дэталёвым аналізе тагачаснай навукова-арганізацыйнай сітуацыі, іх думка выглядае досыць павярхоўнай. Абмяжоўваючыся дазволеным аб’ёмам дадзенай публікацыі, паспрабуем паказаць гэта, абапіраючыся, галоўным чынам на шырокім цытаванні аднаго з дакументаў Акадэмцэнтра НКА БССР.

Яшчэ ў лютым 1921 г., пры абмеркаванні пытання аб універсітэце на II сесіі ЦВК БССР НКА інфармаваў: “Ідучы насустрач развіццю культур

мясцовых моў, мы пры БДУ адчыняем два інстытуты – беларускай і яўрэйскай культуры”. У красавіку 1921 г. III сесія ЦВК БССР пастанавіла: “ ... устанавіць пры ўніверсітэце Навукова-даследчы інстытут беларускай і яўрэйскай культуры” [3, с 16; 10, с. 43]. Аднак, паводле ліпеньскага дэкрэту ўраду аб адкрыцці БДУ, апошні пачынаў сваю дзейнасць без Інстытута беларускай і яўрэйскай культуры.

У сваю чаргу, справаздача Акадэмцэнтра за 1921 г. сярод 19 інстытуцый фіксуе існаванне Яўрэйскага навукова-гістарычнага таварыства [6, арк. 40; 9, с. 54]. Пра тое ж у кастрычніку 1921 г. пісаў вучоны сакратар АЦ М.М. Гуткоўскі [1, с. 19]. Зафіксаванае гэтае таварыства, разам з Інстытутам беларускай культуры, і ў даведцы пра дзейнасць устаноў АЦ ад 1 верасня 1921 г. [4, арк. 4 адв.]. Але яго няма ў штатах Акадэмцэнтра, зацверджаных 26 верасня 1921 г. Тут разам з Навукова-тэрміналагічнай камісіяй пад чацвёртым нумарам пазначаны агульны Інстытут беларускай і яўрэйскай культуры [8, арк. 2]. У згаданай кастрычніцкай публікацыі М.М. Гуткоўскага побач з Навукова-гістарычным яўрэйскім таварыствам прысутнічаюць ужо два асобныя Інстытуты беларускай і яўрэйскай культуры [1, с. 19]. Такім чынам, можа скласціся ўражанне, што савецкая ўлада падтрымала ініцыятыву яўрэйскай нацыянальнай меншасці Беларусі ў яе імкненні да стварэння ўласных навуковых арганізацыйных адзінак.

Пэўным чынам скарэктаваць дадзеную выснову дазваляе інфармацыя, прыведзеная ў запісцы намесніка кіраўніка Акадэмцэнтра С.М. Некрашэвіча Наркаму асветы У.М. Ігнатоўскаму, які адначасова, паводле пасады, з’яўляўся старшынёй АЦ. У ёй утрымліваецца адказ на абвінавачванне загадчыкам яўрэйскага бюро* Франкфуртам кіраўніцтва АЦ у тым, што яно не лічыцца і ігнаруе пытанні яўрэйскага культурнага жыцця.

С.М. Некрашэвіч у канцы снежня 1921 г. пісаў: “Ак. Центр принимает все возможные меры к созданию при Ак. Центре еврейского культурного ядра, и если оно ещё до сих пор не создано, то вина в этом почти исключительно

---

* Цэнтральнае яўрэйскае бюро Наркамата асветы ССРБ [12, с. 44–45].

падает на т. Франкфурта, как руководителя Евбюро и члена Коллегии Ак. Центра.

За весь шестимесячный период существования Ак. Центра от т. Франкфурта решительно не поступило ни одного конкретного предложения об еврейской культурно-научной работе при АЦ.

Эта культурно-научная работа могла проявляться в двух направлениях − в области создания Еврейского Академического Театра и Института еврейской культуры.

Первый вопрос осуществлён, только [не по] инициативе т. Франкфурта и Евтруппа при Актеатре существует. Что же касается второго вопроса − учреждения Института евкультуры, то к данному вопросу Евбюро отнеслось совершенно индифферентно, а между тем инициатива по организации этого учреждения, как специально-еврейского, может исходить только от Евбюро. Академическим Центром с своей стороны были представлены все возможности: 1) учреждена была специальная должность по разработке вопроса об Институте евкультуры; 2) в отношении от 31 октября с.г. за № 859 испрашивалось 30 пайков на названное учреждение.

Не могу не упомянуть о существовавшей до октября м-ца при Отделе охраны памятников старины еврейской комиссии по изучению древностей. При организации А.Ц. в октябре м-це было предложено всем подведомственным учреждениям представить доклады об их работе. В виду того, что представленный доклад Отд. охраны памятников старины был признан неудовлетворительным, этот Отдел был расформирован, а евр. комиссия по изучению древностей, не представившая никаких докладов о своей работе, была причислена к обществам, субсидируемым по мере их действительной работы. Приблизительно через полтора м-ца ко мне обратился т. Франкфурт с претензией, что Комиссия отнесена к обществам. Мною было указано, что это [решение] принято Вами и т. Каценбогиным; однако, мною тут же было заявлено, что если т. Франкфурт находит, что комиссия действительно работала, а не только числилась на бумаге (в чём можно убедиться из того, что Комиссия только через $1^1/_2$ месяца узнала о своём переименовании), то под его, Франкфурта

ответственность, Ак. Центр может зачислить их на службу и найти таким образом способ компенсировать их труд. По видимому, т. Франкфурт в принципе был согласен с Ак. Центром, так [как] в виде компенсации за труды Комиссии предложил одного из бывших членов т. Рабиновича зачислить на паёк. В ответ на это отношение А.Ц. было указано, что паёк выдаётся только состоящим на службе, а потому предлагалось указать, на какую должность Евбюро предназначает т. Рабиновича, но ответа на это отношение не последовало” [6, арк. 28–30–адв.].

Аналізуючы працытаваны дакумент, мусім зазначыць, што на працягу амаль усяго 1921 г., дакладней – да кастрычніка месяца, пры разглядзе навукова-арганізацыйных пытанняў гутарка ідзе пра Інстытут (-ты) беларускай і яўрэйскай культуры. Падчас гэтага звяртаецца, зразумела, увага і на іх штатны склад. Напрыклад, паводле штатаў АЦ, зацверджаных 26 верасня 1921 г., прадугледжвалася заняць на сталай працы ў Інстытуце беларускай і яўрэйскай культуры чатырох чалавек: старшыня, сакратар і два члены па сумяшчэнні [8, арк. 2]. Адзін з варыянтаў каштарысу Акадэмцэнтра на 1922 г. вызначаў асабовы склад Інстытута еўкультуры ў пяць чалавек: загадчык, тры навуковых супрацоўніка і адзін сакратар (для ІБК – 27 работнікаў) [6, арк. 41 адв.]. Што тычыцца кастрычніцкага запыту С.М. Некрашэвіча пра штат ІЯК, згаданага ім у запісцы, то выяўлены намі дакумент некалькі ўдакладняе яго пазіцыю. Па-першае, датаваны ён 30, а не 31 кастрычнікам. Па-другое, адрозніваецца і колькасць асоб: “<...> Інстытут беларускай культуры і Інстытут яўрэйскай культуры, для кожнага з якіх патрабуецца па 30 акадэмічных, па 5 адказных і 3 ударных пайка” [5, арк. 45]. Такім чынам, для кожнай з устаноў прадугледжваўся штат у 38 чалавек. Хаця можна дапусціць, што праз дзень была напісаная яшчэ адна запіска, якая ўдакладняла папярэднюю.

Вынікае, Наркамат асветы Беларусі ў асобах У.М. Ігнатоўскага, С.М. Некрашэвіча, М.М. Гуткоўскага, У.В. Чаржынскага і іншых беларусаў намагаўся стварыць умовы для асобнай структураванай нацыянальнай яўрэйскай навуковай дзейнасці. Але “разумення” з іх боку не знайшоў. Яўрэі не захацелі скарыстоўваць

прадстаўленыя магчымасці. Сведчаннем гэтага служыць і колькасны склад створанай нарэшце ў пачатку 1922 г. яўрэйскай гістарычнай камісіі − адзін чалавек. Дарэчы, у самім Інстытуце беларускай культуры да 1925 г. стабільна прысутнічае толькі адзін яўрэй − Змітрок Бядуля.

Можа быць, індыферэнтнае стаўленне да рэалізацыі ідэі ІЯК абумоўлівалася тым, што адчыняўся ўніверсітэт, праз які, відаць, кіраўнікі яўбюро НКА і імкнуліся наладзіць і актывізаваць яўрэйскую вышэйшую адукацыю і навукова-даследчую работу. Універсітэт быў старой і добра вядомай формай, гарантавана аплачанай у той час, як установы кшталту ІБК і ІЯК, – новымі і невядомымі, з няпэўнай будучыняй. Асабліва, калі ўлічыць, што першапачаткова меркавалася прысутнасць ў іх працы многіх рысаў грамадскіх арганізацый. Відавочна у такім статусе ІЯК уяўляўся яўрэйскай грамадскасці менш прывабным.

На нашу думку, такога кшталту арганізацыйныя мерапрыемствы, калі пакінуць па-за полем зроку палітыку, ды і каляпалітычныя пытанні, не былі патрэбныя для даследавання гісторыі і культуры яўрэяў (8,2% у складзе насельніцтва), палякаў (2%), латышоў (0,3%), літоўцаў (0,1%), маючы на ўвазе ўласна навуковыя ды і фінансавыя інтарэсы. Як згадвалася, з пачатку 1922 г. існавала яўрэйская гістарычная камісія, колькасны склад якой не мяняўся да 1925 г. − адзін чалавек[**]. Яна не пакінула ніводнага следу навуковай дзейнасці больш чым за тры гады. Відаць, меў усё-такі рацыю С.М. Некрашэвіч − справа заключалася выключна ў пайку, якім і задаволілі яўрэйскую навуковую грамадскасць.

Праўда, адзін такі напамін, але ён тычыцца “першай” яўрэйскай камісіі, выяўлены. У канцы ліпеня 1921 г. яўрэйскае бюро звярнулася з заявай у Навукова-літаратурную секцыю НКА з просьбай

---

[**] У сакавіку 1922 г. НКА БССР у хадайніцтве перад АЦ НКА РСФСР пра натуральнае забеспячэнне інфармуе пра двух членаў яўрэйскай гістарычнай камісіі. Тамсама прыведзеная і колькасць штатных супрацоўнікаў ІБК − 54 чалавекі. Дакумент апублікаваны ў зборніку “Інстытут беларускай культуры. 1922−1928” [2, с. 29−30]. Інфармацыя, прыведзеная ў ім не пацвярджаецца ніводным іншым архіўным дакументам, выяўленым на сённяшні дзень. Наадварот, усе вядомыя архіўныя матэрыялы абвяргаюць гэтую канстатацыю. У дадзеным выпадку мы маем справу з меркаванымі (запланаванымі) лічбамі, што ў рэчаіснасці былі значна ніжэйшымі. Зазначаныя акалічнасці не атрымалі навуковага каментару ўкладальнікаў.

камандзіраваць двух – трох спецыялістаў дзеля супольнай працы ў "камісіі па распрацоўцы матэрыялаў жыцця жыдоў у Беларусі". На задавальненне яе хадайніцтва выдзелены Змітрок Бядуля, Я.В. Дыла, У.В. Чаржынскі [7, арк. 21 адв.]. Далейшыя падзеі паказалі, што такое "камандзіраванне", калі яно і адбылося, ніякага плёну не мела. У дадзеным выпадку звяртае на сябе ўвагу погляд на арганізацыю яўрэйскай НДР, калі неабходна было некага "камандзіраваць", верагодна, дзеля таго, каб стварыць беларускі кантэкст нацыянальна абмежаваным пошукам, адмежаваным ад агульнага гістарычнага працэсу і апраўдаць факт існавання самой камісіі, а значыць і пайка.

Вывучэнне наяўных дакументаў дазваляе меркаваць, што ініцыятарамі самастойнай яўрэйскай навукова-даследчай працы выступіла не яўрэі, а беларусы. Прычыну гэтага мы бачым у імкненні пабудаваць нацыянальную рэспубліку ў савецкай форме, завяршыць працэс нацыятварэння. Адсюль, відавочна, планавалася вывесці найбольш моцных канкурэнтаў па-за беларускі кантэкст у галіне культурнага і навуковага будаўніцтва, пакуль не былі прынятыя рашэнні па ажыццяўленню новай нацыянальнай палітыкі на XII з'ездзе РКП(б).

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ


1. Г-ский, Н. Академический центр Наркомпроса ССРБ / Н. Г-ский // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. – 1921. – № 2. – С. 18–20.
2. Інстытут беларускай культуры. 1922−1928 : дакументы і матэрыялы / В.У. Скалабан, М.У. токараў. − Мінск : Беларус. навука, 2011. − 257 с.
3. Каранеўскі, І. Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) / І. Каранеўскі // Наш край. – 1927. – № 10. – С. 16–20.
4. НАРБ. − Ф. 42. − Воп. 1. − Спр. 100. Приказы и отчёты о работе Наркомпроса БССР и подведомственных ему учреждений. 19 сентября 1921 г. – 29 ноября 1922 г.
5. НАРБ. − Ф. 42. − Воп. 1. − Спр. 513. Циркуляры НК РКИ, НКВД БССР и приказы Наркомпроса БССР. 13 июля – 28 декабря 1921 г.

6. НАРБ. − Ф. 42. − Воп. 1. − Спр. 519. Отчёт о работе за 1921 г., смета расходов на 1922 г. и штатное расписание академического центра БССР, отчёты о работе научно-литературного отдела Наркомпроса БССР, Белорусского государственного академического театра и оперно-драматической студии в гор. Москве. 31 августа 1921 г. – 12 января 1922 г.

7. НАРБ. − Ф.42. – Воп. 1. – Спр. 516. Протоколы заседаний коллегии научно-литературной коллегии Наркомпроса БССР и доклад о работе научной секции академического центра БССР. 17 декабря 1921 г. – 30 декабря 1922 г.

8. НАРБ. − Ф. 306. − Воп. 1. − Спр. 9. Штаты Академического центра, утверждённые в заседании штатной комиссии при НаркомтрудБеле. 26 сентября – октябрь 1921 г.

9. Петрыкаў, П.Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П.Ц. Петрыкаў // Весці АН РБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5−6. – С. 52–70.

10. Пічэта, У.І. Савецкая ўлада і пытаньне аб адчыненьні унівэрсытэту на Беларусі / У.І. Пічэта // Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 36–48.

11. Токараў, М. Вывучэнне культуры і гісторыі яўрэеў у Беларускай акадэміі навук / М. Токараў // Беларусіка=Albaruthenica. – Мінск, 1995. – Кн. 4. – С. 133–136.

12. Центральное Еврейское Бюро // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. − 1921. − № 1. − С. 44−45.